цтва, але і класіку філасофіі. Лепшыя творы выяўленчага мастацтва змяшчаліся пад рубрыкай “Кунцкамера” (“Гісторыя мастацтва ў вобразах”). Каляровыя ілюстрацыі суправаджаліся спецыяльнымі артыкуламі.

“Пралеска” змяшчала на сваіх старонках ілюстрацыі з кароткімі каментарыямі ў разліку на выхавацеляў дзіцячых садкоў. Унікальным з’яўляецца тое, што ў “Пралесцы” знайшлі адлюстраванне не толькі творы прафесійнага, але і народнага мастацтва. Такім чынам традыцыя ўключалася ў сучасны культуралагічны кантэкст.

У газеце “Раніца” ў 2000–2002 гадах з’явілася рубрыка “Залатая палітра”, дзе зноў жа каляровую ілюстрацыю суправаджаў арыгінальны артыкул.

Сімптаматычным уяўляецца вяртанне на старонкі спецыялізаванага выдання – часопіса “Мастацтва” якраз у 2000–2002 гадах рубрыкі “У альбом калекцыянера” (лепшыя творы беларускага выяўленчага мастацтва ў суправаджэнні артыкула спецыяліста), а таксама з’яўленне новай рубрыкі “Шэдэўры”, дзе давалася асэнсаванне самых вядомых твораў з гісторыі сусветнага мастацтва. Арыгінальна і даволі часта звяртаецца да класікі газета “Культура”.

На жаль, у апошні час многія беларускія выданні пачынаюць адасабляцца ад класічных твораў, выкарыстоўваючы часцей інтэрнэтаўскую інфармацыю. Хаця ёсць і станоўчы вопыт (некаторыя публікацыі на старонках такіх газет, як “Звязда”, “Беларусь Сегодня”).

Нам здаецца, што класічныя творы павінны часцей не толькі згадвацца, але і асэнсоўвацца на старонках перыядычных выданняў, таму што класічны твор – гэта не толькі ўзор, гэта яшчэ і цудоўная магчымасць асэнсаваць свой час, сваё светаадчуванне ў кантэксце гісторыі.

**Арцём Кавалеўскі**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# ЧЫТАЦЬ?
## Да пытання аб праблеме чытацкага ўспрымання і інтэрпрэтацыі паэтычнага твора

Праблема ўспрымання з’яўляецца вельмі важнай і істотнай у сучаснай метадалогіі літаратурнай крытыкі, бо яна актуалізуе паняцце чытацкага вопыту як адно з найбольш вызначальных у практыцы літаратурнага працэсу. Зварот да праблемы чытацкага ўспрымання пашырае межы да-

следавання і спасціжэння крытыкам літаратурнага твора, які пачынае функцыянаваць і вызначацца ў рамках пэўнай мастацкай сістэмы, які ўключае ў сябе не толькі аўтара (і магчымыя акалічнасці напісання твора), але і чытача (са шматлікімі акалічнасцямі і спосабамі ўспрымання), прычым твор павінны разглядацца комплексна, адносна двух асноўных прадстаўнікоў гэтай сістэмы.

Працэс эстэтычнага ўспрымання не можа не ўключаць такія асноватворныя катэгорыі разгляду твора, як разуменне і ацэнка, асэнсаванне і эстэтычны вопыт, якія ўтвараюць механізм, дзе ў перакантсруяваным выглядзе прадстаўлены агульнакультурныя і асобасныя нормы сацыяльна-эстэтычнага характару. Індывідуальнае эстэтычнае ўспрыманне вызначаецца перш за ўсё спецыфікай прадмета адлюстравання, сукупнасцю яго ўласцівасцей. Спасціжэнне літаратурнага твора праз прызму чытацкага ўспрымання і далейшага крытычнага аналізу непазбежна ставіць перад крытыкам пытанне засваення мастацкага тэксту шляхам яго інтэрпрэтацыі.

Найбольш важнай і істотнай характарыстыкай паэтычнага вобраза з'яўляецца яго ўмоўнасць, шматцэнтравасць і шматзначнасць. Інтэрпрэтацыя ўваходзіць у яе склад як адзін з неабходных кампанентаў пазнання. Успрыманне і разуменне мастацкага тэксту можна ўявіць як працэс «упісвання» новых ведаў ва ўжо вядомае. Існуюць дзве мадэлі разумення. Першая, звязаная з разуменнем у непасрэдным яго значэнні, прадугледжвае рэцэпцыю і ўсведамленне чытачом менавіта таго, што хацеў сказаць аўтар у творы, і другая – інтэрпрэтацыйная: канцэпт і структура таго, што ўжо падвергнута разуменню і так ці інакш усвядомлена, задаюцца не аўтарам, а чытачом (інтэрпрэтатарам). Ажыццяўленне кожнай мадэлі разумення патрабуе ад крытыка шырокага і глыбокага тэзаўруса, г. зн. перадумоўных комплексных ведаў у розных галінах гуманітарнай думкі, бо ад характару перадумоў шмат у чым залежыць тое, якім чынам успрымецца і ўрэшце зразумеецца твор. Пры гэтым істотнымі з'яўляюцца як змястоўныя, так і фармальныя перадумовы разумення. Так, напрыклад, творы разнастайных мастацкіх накірункаў, плыняў і школ разлічаны і арыентаваны на наяўнасць у рэцыпіента перадумоўных базісных ведаў, прычым у творах мадэрнізму і постмадэрнізму (па прычыне іх складанай унутранай арганізацыі) інтэрпрэтацыйная мадэль разумення адыгрывае надзвычай важную ролю.

Актыўныя ўзаемаадносіны чытача і мастацкага тэксту прыводзяць да ажыццяўлення творчага акта, дзякуючы менавіта дзейснай аснове ўспры-

мання і разумення, а таксама па прычыне крэатыўнасці самога тэксту. Сёння даводзіцца канстатаваць разнастайнасць падыходаў да вывучэння і інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту, што дае крытыку не толькі неабсяжны выбар, але служыць прычынай пэўнай разгубленасці, звязанай у першую чаргу з пошукам новых крытэрыяў ацэнкі таго ці іншага элемента твора (вобраза, сімвала, знака, мастацкага прыёму, падтэксту і інш.). У сувязі з гэтым можа ўзнікнуць уражанне аб бясконцых магчымасцях на шляху інтэрпрэтацыі любога тэксту. Аднак найбольш актуальнымі ўяўляюцца наступныя тэндэнцыі: імкненне дэшыфраваць тэкст, знайсці ў ім абагульнены сэнс пры дапамозе разумення шматлікіх мікрасэнсаў; ацэнка тэксту як адлюстравання пэўнай ідэі, праблемы, глабальнага прынцыпу. Сам тэкст з'яўляецца замкнёнай семантыка-сэнсавай структурай. Кампазіцыйная арганізацыя паэтычнага тэксту падтрымлівае яго змястоўную і сэнсавую структуру.

Семантычная структура тэксту, якая разглядаецца як пэўная іерархія сэнсаў, уяўляе сабою арганізаваную сістэму, якая валодае шэрагам адзнак. Пры іх змене і пад уздзеяннем знешніх фактараў яна мяняе канфігурацыю і становіцца новай, але таксама замкнёнай сістэмай, якая, у сваю чаргу, можа пры некаторых абставінах ператварыцца ў іншую. Мікрасэнсы тэксту ўяўляюць сабою складанае, рухомае і ўзаемаабумоўленае адзінства, аднак сума мікрасэнсаў асобных тэкставых элементаў не з'яўляецца роўнай агульнаму сэнсу цэлага твора; у сваю чаргу, сэнс усяго твора не роўны шматлікім мікрасэнсам асобных элементаў тэксту. Пры разглядзе сэнсу мастацкага тэксту неабходна ўлічваць сістэмы правілаў, якія садзейнічаюць аб'яднанню асобных мікрасэнсаў і ўяўленняў пра іх. У выніку выкарыстання сістэмы правілаў аб'яднання мікрасэнсаў, рэфлексіі, а таксама эстэтычна-духоўнага вопыту, які ўжо маецца ў крытыка, адбываецца працэс інтэрпрэтацыі. Такім чынам, сэнс мастацкага твора разглядаецца на ўсіх ўзроўнях тэксту.

Адна з асноўных мэт мастацкага камунікавання, узаемазносінаў чытача з тэкстам, як правіла, эстэтычная; мастацкая мова не звязана наўпрост з практычнай дзейнасцю чалавека і таму не мае прадпісальнага характару. Звычайная перадача інфармацыі ў працэсе мастацкага камунікавання выступае, хутчэй, як сродак, чым як мэта, а таму і каштоўнасць мастацкага тэксту заключаецца ў тым, што яна дае нам заўсёды унікальную магчымасць самім даканструяваць аўтарскі тэкст у сваім фантазійным уяўленні.